# Стары палац у новым убранні

**Дзяржаўная камісія Камітэта па рэстаўрацыі помнікаў пры Міністэрстве культуры Беларусі подпісала, нарэшце, акт прыемкі Пружанскага гістарычнага палаца, да рэстаўрацыі якога тут прыступілі шэсць гадоў назад.**



Гэтай унікальнай архітэктурнай каштоўнасці пашанцавала намнога больш, чым мноству іншых помнікаў палаца-паркавага мастацтва. Архіўныя крыніцы сведчаць, што на пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі сучаснай Брэстчыны існавала каля 1000 гістарычных палацаў, сядзіб, але толькі адзінкі дажылі да сённяшняга часу. Сярод іх, безумоўна, і Пружанскі палац-паркавы ансамбль, які больш за 150 гадоў здзіўляе і вабіць сваёй прыгажосцю, гістарычнасцю і архітэктурнай вартасцю.

І гэта невыпадкова. Справа ў тым, што яго, як і іншыя архітэктурныя каштоўнасці, стваралі знакамітыя дойліды, а ініцыятарамі і фундатарамі будаўніцтва выступалі заможныя людзі, безумоўна, выхаваныя ў лепшых традыцыях еўрапейскай культуры.

...Пасля III падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе расійская імператрыца Кацярына II падаравала пружанскія землі актыўнаму ўдзельніку падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 года пад кіраўніцтвам нашага славутага земляка Андрэя Тадэвуша Касцюшкі фельдмаршалу П.А. Румянцаву, які хутка іх распрадаў мясцовым заможным гаспадарам: Трымбіцкім, Булгарыным, Влодэкам...

Цэнтр Пружан разам з мястэчкам перайшоў ва ўласнасць даволі знатнага роду Швыкоўскіх. Новы гаспадар Валента Швыкоўскі, маршалак шляхты, у першай палове XIX стагоддзя – каля 1830 года – адбудаваў паблізу цэнтра горада арыгінальную рэзідэнцыю.

Для стварэння праектнай дакументацыі палаца-паркавага ансамбля быў паклікаsucceeded знакаміты архітэктар Францішак Марыя Ланцы, які выдатна прыдаў архітэктуры палацыка нерэгулярны, неарэнесансовы стыль "мадэрн".

Будынак палацыка – гэта дзве групы разнавялікіх аб'емаў, прыгожая квадратная вежа, паўкруглая веранда, вялікая тэраса на калонах. Інтэр'ер будынку быў аздоблены ляпнымі прафіляванымі карнізамі, камінамі, дэкарыраванымі дзвярыма.

Вакол рэзідэнцыі залажылі багаты на экзатычныя дрэвы парк. У спецыяльна адбудаванай аранжарэі гадаваліся апельсінавыя і лімонавыя дрэўцы, пальмы, міртыі іншыя экзоты, якімі ў летні час упрыгожваўся парк. Гэтай справе ўвесь свой вольны час прысвячаў бяздзетны маршалак Валента Швыкоўскі.

Хараство палаца-паркавага ансамбля існавала нядоўга. За ўдзел у паўстанні 1863–64 гадоў сядзібу Швыкоўскага царскія ўлады канфіскавалі, а сам маршалак вымушаны быў з'ехаць у эміграцыю, дзе асеў у Бельгіі і зарабляў на хлеб простым садоўнікам. Аранжарэю зачынілі, а ўсе экзатычныя расліны перавезлі ў Імператарскі палац Белавежскай пушчы.

У 1867 г. Швыкоўскі вярнуўся ў Пружаны да сваёй жонкі Германіі. Маёнтак быў яму вернуты. Пахаваўшы жонку, Швыкоўскі прадаў маёнтак графіні В. Кляйнміхель (Арбеліяні) і дажыў свой век у Варшаве, дзе памёр у 1900 г. Быў пахаваны побач з жонкаю на каталіцкіх могілках у Пружанах.

У міжваенны перыяд у палацыку размяшчаліся павятовыя ўлады, а перад 1939 г. у ім пражываў пружанскі староста.

Пасля апошняй вайны ў будынку размяшчаліся дзіцячы садок, затым – стаматалагічная паліклініка, дзякуючы чаму палацык уратаваны ад знішчэння. Зараз ён зноў вернуты да жыцця на сродкі дзяржавы. У ім плануецца адкрыць раённы музей-сядзібу, дзе будуць экспанавацца каштоўнасці па гысторыі і сацыяльна-культурным жыцці Пружаншчыны.

А нам застаецца падзякаваць архітэктарам, рэстаўратарам, іх кіраўнікам у Мінску, Брэсце, Пружанах і, ў першую чаргу, прарабу Пружанскага рэстаўрацыйнага участка А.М. Кубіка за добрую справу. Дарэчы, на працоўным рахунку пружанскіх рэстаўратараў ужо некалькі аднаўленых аб'ектаў, у тым ліку – гандлёвыя рады, помнік-капліца 1812 года пад вёскай Паддубна.

Зараз ад рэстаўратараў чакаюць дапамогі наступныя паўразбураныя гістарычныя каштоўнасці: палац у Каштанаўцы, будынак царквы ў вёсцы Мокрае, касцел ў Лыскаве, руіны замка Сапегаў у Ружанах...

Пажадаем усім, хто мае дачыненне да аднаўлення і падтрымкі гэтых помнікаў гісторыі і культуры, здароўя, добрага настрою і новых працоўных здзяйсненняў. Спадзяемся, што Пружанскі палац-музей хутка гасцінна адчыне дзверы пакояў і зноў парадуе сваёй неўміручай прыгажосцю турыстаў і гасцей.

**Леанід НЕСЦЯРЧУК,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**сакратар каардынацыйнага савета па ахове гістарычнай спадчыны.**

Пружанскі раён.

**На здымку: палац сёння.**

**Фота Эдуарда КАБЯКА.**